БІБЛІЯТЭКА
ЧАСОПІСА
НАША ВЕРА

Ніна Мацяш

# Богава дрэва

*Вершы*

Мінск
Выдавецтва «Про Хрысто»
2004

УДК 82.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
М 35

Серыя заснавана ў 2002 годзе.
Рэдактар серыі К. Лялько

ISBN 985-6628-59-8

© Мацяш Н., 2004.
© ВУП «Выдавецтва «Про Хрысто», 2004

## СХОВАНКА

Паэту ў часу жорсткіх ловах
ёсць прывідны ратунак:
    слова.

## ЖЫЦЦЁ – ЯК КАЗКА

*Да партрэта Сент-Экзюперы*

Жыццё, сапраўды, як казка:
ідзеш ад бяды да бяды.
То сцюжна, то слізка, то гразка,
то моташна да жуды.

Туманам забрана поле.
Ідзеш ад падзей да падзей.
Але не сляпая доля,
бо плуг твой цябе вядзе.

Канчаецца ўсё шчасліва, —
шчаслівы ў казак канец, —
заснеш пасяродку нівы,
спакоены ўрэшце жнец.

## СКРЫПКА

Скрозь —
богава дрэва* ды скрыпень.
Надхмар’я і долу бяседа.
Адкуль,
кім забытая скрыпка
тут, дзе ні сцяжыны, ні следу?

Зусім учарнелая дэка.
А струны іржою не ўзяты...
Ці гэта
душа чалавека,
што фібрамі ўсімі напята,

каб суадпаведна азвацца
і на матылька, і на жабу,
не ўмеючы гукам схавацца, —
сама
ці брыда, ці
ці паваба?..

* Разнавіднасць палыну (Artemisia procera, палын высокі).

## НАКІДАЮЦЬ...

Вецер водарыць упарта
першацветаваю цнотай.
...Накідаюць мне пагарду:
свет не варты пашаноты.

На стаптаны поплаў выйду —
у сіле шарону ранне.
...Накідаюць мне агіду:
свет не варт замілавання.

Што мінецца хмараў навісь —
суцяшэннейка слабое.
...Накідаюць мне нянавісць:
сэрца плача па любові.

## ЛАСТАЎКА

Заручаная даўніною
з тутэйшым кутам, як і мы,
шчыруе ластаўка вясною,
адпрэчваючы ўціск зімы.

Шчыруе ластаўка ўсё й лета,
ці градабой, ці сухавей,
дзеля гняздзечка, дзеля дзетак,
як мы дзеля сваіх дзяцей.

Каб перад золлю непазбежнай,
перад глухой навалай хмар
загартаваліся належна
моц крылаў, дух, любові дар.

І птушачцы малой вядома,
што нам свядома трэба знаць:
любоўю толькі можна стому,
жыццё і скон свой апраўдаць.

Лучвом нязрадліва святлістым
з абжытай родам стараной,
дзе восень спелым, вольным лістам
кружляе ўжо і нада мной.

Ах, ластавачка!..

## НЕ ЧУЕ

Усшэсця Госпадава дзень.
Вялічанне Усёмоцы Духа.
Прыпятых да зямлі людзей
слоў шаматкая пацяруха.

Спаклонліва цалуе крыж
хто целам, хто душой калекі,
і вочы кожнага — наўзвыш,
і модлы кожнага — пра лекі.

А строгасць воблікаў Святых
тысячагоддзі ўсцяж вястуе:
Гасподзь схіляецца да ўсіх,
ды
  духам ніцых
            Ён не чуе.

## ЗЕРНЕ

Калі спелае зерне пшанічнае
падае ў глебу,
вылушчваецца з яго
пшанічны колас.
Калі чалавек у зямлю сыходзіць,
вылучшваецца з яго
зернейка духу.
Толькі чалавек помніць,
што пшаніца была аўсюгом,
і памагае ёй быць пшаніцай.
Толькі чалавек забывае,
што быў ён глінаю
і што хлеб надзённы
здольны браць яго ў рабства.
Калі зерне пшаніцы
падае ў глебу,
вылушчваецца з яго
пшанічны колас.
Калі чалавек у зямлю сыходзіць,
вылучшваецца з яго
зерне духу.
Зерне духу раба,
які воблік набудзеш?

*   *   *

Калі б замовіла свой страх,
калі б яго я пазбылася,
душа не чэзла б у мурах,
душа купалася б у ясі.

Надарваецца ж гэткі цуд:
бы збоч самой сябе стаю я,
а ўсё, што мне балела тут,
як падаліст, ля ног шумуе.

Не вусцішна ні за сябе,
ні за радню, ні за сябрыну,
ні за бяссілую Айчыну:
хіжак ёй печань не дзяўбе.

Бо годны вызначаны шлях,
і ланцугі сарваны з духу,
і рух разгортвае абсяг
бязмежжа
за вяршыняй скрухі...

Надарваецца ж гэткі міг!..

## ДА СУСТРЭЧЫ!

Маўклівым развітальным клінам
ляцелі гусі над Берлінам,
а мы па Мюлерштрасэ йшлі
і ўслед за выраем гусіным
вачыма ўзрушана вялі.

Адкуль вы, гусі? З Беларусі?
Куды вы, гусі? Ў цёплы край?..
Няма адказу. Знай цярусіць
сняжок з нябёсаў, быццам гусі
свой пух страсаюць на «бывай».

Халодны пух ляціць — не тае,
і на плячах не растае.
Так і Айчыну замятае...
Даўно старонка дарагая
нам на цяпло сваё скупая.
Любові ад людзей чакае.
Не ўмеюць людзі грэць яе.

Мы заўтра вернемся дадому.
У непагадзь, у безладзь, стому.
З чужыны — бы на чужыну...
Вам, птахі вечныя, вядома,
як цяжка з золі, з ледалому
выдабываць крыльмі вясну.

Да стрэчы, гусі!

* * *

Адыходзяць мае беларусачкі,
адлятаюць дзяўчаткі...
Як цнатлівыя краскі,
што толькі да траўня свайго дажылі,
толькі шчыра ўсміхнуліся роднай зямлі —
і няма, і знікаюць,
пакідаючы нам толькі згадкі.

Толькі цень свайго побыту:
шпільку, хустачку, чаравічак,
рэха смеху ці песенькі,
вобліку ўяву...

Божа Ласкавы, не адрынь,
прыгарні да сябе
нашых знічак!..

Хай набудзецца ім,
колькі схочацца,
у Тваіх іншасветах;
хай да шляху далейшага іхняга
шчодра прыточыцца
радасці
за ўсю скруху
непавянчанага з імі
беларускага лета...

## БУДЗЕМ!

Не знемагайма ў адчаі, сябры,
не знемагайма.
Сцюжа люцее на нашым двары:
пры вогнішчах духу чувайма.

Не ўпершыню зліхадзееныя мор
так  пагражае
краю прыкляклых братоў і сясцёр,
беларускай дзяржаве.

Не ўпершыню «спагадае» сусед,
хочучы ў сплату
нашы — за свой дабрачынны абед —
спрадвечныя мову і хату.

Будзем адхукваць зынелую рунь,
колькі магі ёсць,
дзеля ўмалоту і шляху ў зару
вольнасці,
            а не ў магілу.

Будзем!

* * *

Асвойваем юдоль мы ненамарна:
у кожнага зярняці — пэўны шлях.
Нічога, што йшчэ так абложна хмарна:
вясны ўжо квет завязаны ў палях!

Не пойдзе ён у пустацвет;
            не згіне
узгадаваны працай
            волі плод:
аддадзены адроджанай Айчыне,
саміх нас не аддасць на глум, на звод.

Здабудзем долю, радасцю багатай,
сагрэем душы ўсіх
            цяплом сваім.
Яшчэ прыластаўчыцца наша свята,
Яшчэ прытульна будзе люду ў ім!

## З ГРАВЮРЫ А. КАРАТКОВАЙ

*Нілу Гілевічу*
*з пашанотным паклонам і любоўю*

Самотнае летняе дрэва. Магутны камель
у глыбокіх шнарах і пасечынах,
і галлё панявечана.
Але крона — жывая,
і грунт — не схіснецца!
Нахабненькі хмель,
моцай дрэва ўтрывалены,
ўгору віецца.
Небакрай паласаты, бы чмель.

## ЗАЛАТАЯ ДЗІДА

*Валянціне*

Тваё жыццё і праўда — як прадвесне,
калі зіма змагаецца з вясной,
калі нябёсаў жаўрукова песня
ледзь выжывае ў золі снегавой.

І немач цела, і зямныя страты,
і марны пошук праўды на зямлі, —
як сіляцца яны твой дух за краты,
у гіблы лёх адчаю пасяліць!..

І як бы йшчэ, якім бы чынам-дзівам
убараніцца б ад бяды ён змог,
калі б не той святоўны абярог —
тваёй любові залатая дзіда?

## ПЧОЛКА

Сшывае лёс крывой іголкай
памкненні й чыны ніткай скрухі.
Душа нектар свой,
 быццам пчолка,
усё шукае ў полі руху.

Нічым пагрэбаваць не можа,
хоць не заўсёды патрапляе
з падзейнай наквеці варожай
жывіцца тым, што прасвятляе.

І мус уроку паўтарацца,
пакуль не ўсвоіцца належна,
што не ад змены дэкарацый
спектакль
 і ролі ў ім
 залежаць.

## УГНЯЗДУЙ МЯНЕ Ў СЭРЦЫ

*Паку Чжэ Ву, С. Я. Іофэ*

Пілігрыму ад поўдня да поўдня
цераз плыўныя нетры часу
зоўна выблісnуў промень з Усходу:

— Я апірка твая: не будзеш
выпускаць мяне з рук у дарозе —
не зняможашся па куп'іску,
па каменні не падаб'ешся.
Я — апірка твая. І кладка:
не сцураешся, не разбурыш —
правяду цябе лёгка, лётка
цераз твань і цераз правалле.
Кладка я твая.
І апірка.
І цяпельца на гострых проймах:
і сагрэю я, і разважу,
і ў жарынку сэрца зыначу,
калі ў сэрца мяне ўбярэш ты
як святло, як святло любові.

Калі ў сэрца мяне ўбярэш ты,
калі мне аднаму слугавацьмеш —
успануеш сам над сабою,
над памрокам і над бядою,
над ступою між зор, пілігрыме.

Угняздуй мяне ў сэрцы.

* * *

Пры сцежцы
гарыць куст ружавы.
Мінаюцца з ім людзі
і зрываюць
дзівосныя бутоны.
Рукі ж мае —
          пустыя.
Бо сцежка не мая?

* * *

І гэтай ноччу —
            даўні сон:
усё ніяк не дапускае нешта
здаць
экзамен па замежнай мове.

...Усё ніяк, відаць, не выспеліцца
нейкі мусовы плод
на голлі маёй дніны.

## 11 ВЕРАСНЯ 2001 ГОДА

Госпадзе, ёсць жа Ты недзе, калі Ты стварыў
свет гэты гожы, дзівосны наш свет негадзяшчы!
Чорнае зло раззяляпіла жудную пашчу,
а ці Ты Сам так пагрозліва загаварыў?..

Я не блюзнеру. Павінен жа недзе Ты быць,
бачыць, як людцы дарункі Твае зневажаюць,
чуць, як Твае запаветы трагічна скажаюць,
як тоесамяць «любіць» з вычварэннем «забіць!»...

Багаты Манхатан — не сон, як і гэты — не сон:
імгненне — і выбухна рушацца ўніз хмарачосы,
і тысячы жыццяў стаюцца адным страшным Лёсам,
і свет ужо іншы: свет бачыць Твой Армагедон...

Як адцяпер — па праяве такой — жыцьме люд,
і той, хто ў жалобе, і той, хто ад радасці скача?..
А голас ЖЫЦЦЯ над прадоннем і кліча, і плача:
«...Шон, гэта я... я люблю цябе, Шон... я люблю...»

* * *

Дзеля чаго Ты, Божа,
з неба звёў мяне ў бездарожжа?

Каб за прывідам тузалася,
і плакала, і спявала,
слёзы словам сваім
сама сабе выцірала?

Бо ўжо ж у які бок жыцця ні гляну —
і воддаль, і побліз —
смутку й смутку паляны.

Толькі ў нетры душы —
і хадзіць не патрэбна —
Тваім спагаданнем
вогніцца мая папараць-кветка, маё шчасце —
трыванне.

## ПАСЛЯ ШТОРМУ

Глыбокае ранне, глыбокая ціша.
І толькі заілена ўздрыгваюць хвалі.
«Мінулася бура, —
            знясілена пішуць, —
прайшла,
прашалела.
Зноў ранне. Зноў ціша.
На беразе гэтым
зашмулена-бурым
вось-вось людзі з’явяцца —
выпладні буры.
Па ёд.
Па бурштын.
Па абломкі —
хто ўчора
блакітны свой паруснік
даверыў мору».

* * *

Узіраешся ў побыт —
бы расчытваеш почырк чужы, незнаёмы.
Зноў і зноў намагаешся ўцяміць
сэнс кожнага знаку —
іначай
застанецца замкнёны
сэнс
          і слова, і тэксту ўсяго.

Можа, гэтым хоць разам
патрапіш?

## ВОРАН КРУЖЫЦЬ

Я шукала чараўніцу,
ах, шукала,
каб мяне ад варання
паратавала,
каб яно штодня-штоночы
не кружыла,
каб я цяжка так па сонцу
не тужыла.

Абышла я паўкраіны,
паўзямліцы,
не знайшла нідзе жаданай
чараўніцы,
бо яны, бо і яны
па сонцу тужаць,
бо над кожнаю душой
свой воран кружыць...

* * *

*І.Ул. Баярчуку*

Недзе ўзважваецца наш унёсак
у Жыццё
          ў зямной гэтай юдолі.
Ці адхмарацца калі нябёсы?
Ці нап’ецца сэрца шчасця ўволю?

Будзем помніць: ледавік сыходзіць.
Будзем помніць: і патоп мінае.
Хоць, здаецца, сілы на зыходзе,
крык душы ў пустэльні прападае...

Але сіл даецца роўна столькі,
колькі трэба, каб стрываць пакуту.
Ветрам хіліцца да голькі голька,
кожны лісцік хоча быць пачутым...

* * *

Воблака душы з улады тлуму
вынесці пад воблака бярозаў:
хай пагоіцца зялёным шумам,
        крыльцамі стракозак.

Бо пайшло яно ўжо проці ветру,
бо грымотамі ўжо набракае,
бліскавіцамі ў сцяжэлых нетрах
        ластавак лякае.

Пастаяць у верасня ў прысенках.
Неба ў крыжыках стрыжоў рахманых.
З воблака бярозаў спель насення
        сыплецца, як манна...

* * *

Яшчэ ўсё навіваецца вопрадзень
утульнасці, супакоенасці, святла, —
толькі б хто не чапіў
груба, жорстка выкручанага крыла,
толькі б хто —
незнарок, а ці неабачна —
зноў не вымкнуў ранейшага болю!..

Хай хоць трохі яшчэ
патрымае ў сваім прыполе
абярэжлівая спагада нябёсаў
на доле...

## БРАТ-СЯСТРЫЦА

Пусцема ў сэрца гэтую вясну,
яна так скрушна стукалася ў дзверы.
Што дакідалася каму ў віну,
паглядам брат-сястрыцы пераверым.

Вачэй яе пяшчотны аксаміт,
дзе аплывае сонейка лілова,
гатовы
нас вярнуць сабе самім,
да ўдзякі лёсу за любоў
гатовых.

Багаславім сустрэчы таіну,
багаславім і несустрэчы бераг.
Пусцема ў сэрца гэтую вясну,
яна так скрушна стукалася ў дзверы...

* * *

Звычайны,
беспадзейны дзень.
Нічога не чакалася,
і ўжо нічому сёння не адбыцца.
Лілейкай гойдаецца сэрца
ў затоцы
пяшчоты невытлумачальнай...

# ДАРУНАК ЛЁСУ

Аж з будучыні
ў шчылінку між немагчымасцю і сном
патрапіць
бляск ад свяцільні
людской зычлівасці ды шчодрасці душэўнай —
і адлагодзяцца
намеры злыя часу і прасторы,
адладзяцца варункі,
каб прагучала прыбянтэжанае —
а хоць такое во —
прызнанне:
— Дарунак лёсу —
падарожжа гэтае маё
ў Парыж...

## СКРЫПАЧ

Уцёк у мушлю музыкі,
а так глыбока, так глыбока,
што да яго балкона на другім паверсе
не дапясці
ўжо ніякім воклікам
вячэрняга Парыжу.

Стаіць сабе скрыпач і грае
на ўласным беразе —
нямога для бадзяжнікаў аглухлых —
іншасвету:
у мушлі музыкі.

## ПРЫСТАНАК ЗВЕЦЦА «ШЛЯХ»

Так сонечніцца зараз
куточак гэты горны:
лагі ды скалы ў хвоях,
латкі снегу і пясок сыплівы
пад асцярожлівай ступою!

Спускаюся да ўзножжа,
ведаючы, як —
лягчэй —
вярнуся
на гожую гару гэтую, дзе
з людзьмі дзелены
часовы мой прыстанак звецца
«VIA».

* * *

І ветрам звейваліся,
і натоўпамі затупваліся,
паліліся апоўдні сонцам,
а апоўначы
з усякім смеццем разам
змываліся вадой, наплыўнай
з-пад парыжскіх тратуараў,
сляды ног нашых.

...Ды вось —
выглядваюць,
жывыя,
з закануркаў памяці
і нам вяртаюць
не сухаліст вандроўкі,
а востры водар квету
духу чалавечага
і да людзей любові.

## ЛІСЦЁВАЯ ЗАВЕЯ

Лісцёвая завея кружыняе,
заплюшчу вочы — і мяне няма...
Душа ў такой аддалечы лунае,
як быццам і не ведала ярма.

Што верадна гняло бесперастанку
ды ўкараняла несмач і тугу,
як смецце, здзьмухнуў посвіст берасцянкі
ва ўзрушанага верхавецця гул.

Там радасна куляецца вятрыска,
уторыць берасцянцы бас-дудой,
і падалісту залатая пыска
цалуе неба ўзнёсласці й маёй.

Лісцёвая завея кружыняе,
заплюшчу вочы — і няма мяне...
Душа ў такой аддалечы лунае,
куды зямное смецце не сягне.

* * *

З паўдня — пяшчотных промняў паўнаўладдзе,
дыктат цяпла й спакою па-над краем.
Блакіт нябёсаў подымкавай гладдзю
задумліва прырода вышывае.

Туга, дасюль хаваная ад вока,
малюнкам неакрэсленым, глыбокім
да сэрца падступае блізка-блізка...
Усё, у рэшце рэшт, стаецца прыскам...

Вось гэтаю смугою папяловай
у жмені часу на бязжальным ветры
згарання
    на пярокрыжы любові,
    надзеі, веры...

# ПАДАННЕ ЛІСЦЯ

Паданне лісця
дзюравіць паветра.
Яно патрапляе
тут жа зацыраваецца.
А ў лістападавым свеце
нашых повязяў —
блізны ды блізны,
радня...

## МАРОЗ НА ДВАРЭ

Ці не холадна табе, мама?
Мароз на дварэ.
А ты ўсё трымаеш
          у далонях сваіх
                    некалькі каласкоў,
а ты ўсё трымаеш
          у далонях сваіх
                    некалькі васількоў,
каторы ўжо год
          іх
                    да грудзей прыхінаеш.
Але гэта ніколечкі не кранае
сурова-сцярожкага крыжыка
          над тваёй галавою.
Праз маўклівую праінелую хвою
шматочак неба ўзіраецца,
як вусны твае —
          каторы ўжо год!.. —
                    усміхаюцца
ўсё адной і той жа ўсмешкаю.

А я
ўсё ліпею на гэтым,
ужо нясцерпна няўтульным узмежку
між марозным буднем маім
і тваёй лагоднай імглою.
Баюся, што гэта ты
мяне тут —
              навошта? —
так доўга, так доўга трымаеш.
Хачу быць з табою.
Холадна мне, мама.

## У ТОЙ ХАЦЕ

Там, дзе ложак твой стаяў, —
пустое месца.
Хутка ўсё, усё адменіцца ў той хаце.
І хадзіцца будзе йнакш, і піцца-есца,
і начынне ўсё
свой сэнс ранейшы страціць.

Душы новыя ўва ўсё ўнясуць абнову.
Столь і сцены на свой густ пераніцуюць.
Пасярэбраць спадзяваннямі падкову
і над самым сэрцам болю прымацуюць.

Там, дзе ложак твой стаяў, —
пустое месца.
Толькі голас шчэ ляціць звышы-звысоку,
тваё ледзьве ўжо дасяжлівае мецца...
пра любоў... пра супачынак... пра вясёлку...

* * *

*У вянок Ганне*

Для кожнага тут
знайшлося ў мяне слова добрае
і на сустрэчу, і на развітанне.
Перазовы ж з табой
пажыццёвай журбой
абсякло
тваё неадгуканне.

Скрыжоўваю рукі,
як табе скрыжавалі былі —
на сэрцы, на чашы,
каб душы нашы
адна ў адну паўзіраццa маглі,
на мове агню цяпер ужо
бясконцую
гамонку вялі...

# З ДУМКАЙ ПРА БАЦЬКУ

Сягоння Твой апошні дзень зямны.
Тады, у тое нарванае лета
было яшчэ нам невядома гэта:
сягоння
 Твой апошні дзень зямны.

Руды, спякотны жнівень на двары
пры сола невідомае віёлы, —
гнятліва сэрцу і гнятліва долу:
руды, спякотны жнівень на двары.

Чародка ластавак на правадах
звярае й мой кірунак выраёвы
у вечных ловах часу негульнёвых, —
чародка ластавак на правадах...

Бы ў родным доме, ў наўскай старане
зноў папрыгадваем з Табой радзіну,
паўглядваемся ў лёс, у крыж Радзімы,
бы ў родным доме, ў наўскай старане.

Дух бачыць далей і глыбей, чым зрок:
нізрыне цемрашальную калоду
моц вольнае дзяржавы, моц народу, —
дух бачыць далей і глыбей, чым зрок!

## ПЕСНЯ ЗМЯІ
(да «Маленькага прынца» Экзюперы)

Як сцяжыны ні мецяцца —
іх пяском занясе.
Як зяліны ні квецяцца —
перавянуць усе.

Колькі б сцюжы ні рынула —
кветкі зноўку цвітуць.
Колькі б сцежак ні гінула —
людзі некуды йдуць.

Як разгадкі ні множацца,
а загадкам — ні дна.
Як ні маецца-можацца,
а развязка адна...

## НЕ СПАЗНІСЯ

Толькі мо ў казцы ёсць лёс —
          нібы кошык,
поўны адно медуніц ды суніц.
Бойся спазніцца са словам харошым:
тонка прадзецца жыццёвая ніць.

А ліха не спіць...

Ах, запіваць бы сухую скарынку
наканаванага —
          з чыстых крыніц!
Бойся спазніцца з харошым учынкам:
Тонка прадзецца жыццёвая ніць.

А ліха не спіць...

## ЧУЙНАР

«Ты на зямлі, каб несці крыж з пакорай,
наканаванне дзейснячы сваё.
І ты чыймусьці трудаванню ўторыш,
і хтось мацуе спраўджванне тваё.

Інач усё, што можаш перайначыць,
вітай усё, над чым не ўладны ты.
Што ж да аддачы... Не чакай аддачы.
Не тут яна. За рысай нематы.

ТАМ
          адтайнуецца ўся патаёма
заломаў лёсу і цярпення дар».

...Пазыбваўся ў начным дзвярным праёме
бялёсы цень — дарог маіх чуйнар.

# ПЯТНАЦЦАТЫ САНЕТ

Зграбае лісце ў скверыку юнак,
дзяўчаты грады кветак парадкуюць,
рабінавыя гронкі правакуюць
пакаштаваць спякоту іх на смак.

Пажоўкла вінаградная лаза,
акацыя ў струках насення рыжых.
Дзень кожны гук на павуцінку ніжа.
Цалуе хрызантэміну аса.

Знячэўку ўсхліпне вецер — і заціхне,
утоіць жаль і свой, і мой, і ўсіхны,
схавае ў слотнай заўтрашняй струне...

Свет шчэ ўсё гожы, шчэ ўсё каляровы,
як тое, незабытае мной слова,
што ты шапнуў на ўскрайку лета мне...

* * *

Ад’ехаў ты
і на забеленым падворку
незатаптаныя сляды твае
не азіраюцца на мае вокны.

Так рана сёлета ў нас выпаў
снег...

## ЯШЧЭ ПОМНІЦЦА

Скуль такая лютая натома,
што цяжарам нават згадка: ты?..
Выпесціла сонечную строму:
працінае холад пустаты.

Недзе сонца... Недзе ты... Скрозь нема.
Рукі не галубкі — ледзяшы.
Недзе ты... А я не прагну неба:
дагарае свечачка ў душы.

Як жа трудна дыхаць мне, каханы.
Умываюся тугой — пячэ...
Свет не толькі з болю тут сатканы.
Мне пра гэта помніцца яшчэ.

* * *

Слова маё не накліча бяды,
вока маё не злое.
Шчасця твайго не сурочу й тады,
як будзеш ты не са мною.

Толькі аднойчы, пры цёмным акне,
у задуменні мройным
неасцярожна згадаеш мяне —
і смутак ляжа гарою
на ўтульнасць тваю,
на вясёлы твой дзень,
на памяць пра нас абоіх,
дзе я, нібы голачка на вадзе,
трымалася на любові.

## ТРОХІ ДЗІЎНА

Трохі дзіўна: не счулася, паяснеў калі
мой дрымучы лес над вадою цёмнай,
дзе лябёдачка з лебедзем —
у іншасвеце —
плылі.

Трохі дзіўна: больш не ведаю стомы
рухаў пустых,
неўмалотных думак атрута
страціла сілу.

...Дзесь плывуць сабе
            тыя лебедзь з лябёдачкай...

Дзякуй, сэрца, што іх
у невараць
адпусціла.

Ззянне крылаў тых птахаў шчаслівых
яшчэ
стукам тваім гарачым
мяне дагоніць,
іначай
так несмутліва
не світала б сягоння.

* * *

Бачыць Бог,
ты напраўду рады,
калі я сама
да цябе азавуся,
ты напраўду рады,
і гэтаму, бачыць Бог, рады
няма.
Адхварэлі?
Закаяліся?
Трапятліва малюся
да роўнаапостальнай Ніны:
памажы нам, Святая, ўтрымаць
і на цяперашняй сцюжы
наш трыкір,
нашыя тры святліны:
свечкі,
птушкі
і ружы!..

## НА ЗМЯРКАННІ

Сярнічкай успалымнёнаю
успалымнёная свечка
гарыць-згарае,
сябе ў новую форму пераплаўляе.

Што як можа,
так дзеі гэтай і спрыяе:
жар, і кнот, і свечка самая,
і паветра халоднае, што яе атуляе.

Была калонаю —
сталася гронкаю вінаграднай,
што прыляпілася на камлі
маёй задумнасці
вечаровага саду.

Па адной
асыпаюцца вінаградзіны,
рвуць думак цьмянае, ухілістае,
далікатнае прадзіва.

Задзьму пялёстак агню,
хай ацалее агарачак —
на тую часіну, калі жывуць
ужо ні пра што не марачы.

* * *

Божа,
Ты й дзеля мяне расхінуў белы свет:
дзякуй!
Вось, расхінаюся й я прад Табою,
растапляюся —
да самастраты,
да страты ўласнае самсці зямной,
каб святоўнай святлотай
растапілася
горкая пладавіна
абмежаванасці і спаняволі.

# ПАВОДЛЕ КАРЦІНАЎ М. К. ЧУРЛЁНІСА

## 1.
## **Дзень**

Ніяк не ўстаць,
ніяк не распрастацца,
у невядомасць цягне, бы ў смалу.
Але ўпіліся ў край планеты пальцы,
усходзіць галавы цяжкой валун!

А за спіною —
дзень таго не бачыць, —
хай бачаць тыя, хто сустрэне дзень! —
як тайны вырыс Космасу,
маячыць
светлая постаць —
ЧАСУ пільны цень.

Ляжыць зямля пустынная, нямая.
Стварэнню свету йсці ў каторы раз!..
Глядзіць наўпрост у вочы, не міргае,
з засцерагальна ўзнятым пальцам
ЧАС.

2.
**Стралок**

На сумежжы ночы й дня —
вусцішная цішыня:
на паўнеба — крылы чорнай
хіжай птушкі велізорнай, —
уцялесненасць бяды!..

І ўцячы — няма куды...

Цяжкі лёт, драпежны зрок...

ТЫ
            забі яе, Стралок!
Вымкні, вымкні ў сэрца злу
пераможную стралу!

І ўсміхнецца вышыня
на сумежжы ночы й дня.

3.
**Казка**

На пагорку, на траве, бы ў жыце,
голенькае дзіцянё сядзіць.
Дзе ж вы, людзі?! Людзі, паглядзіце:
у назалатаўленым блакіце
чорны, чорны, чорны птах ляціць!

Ён ужо кружляе над дзіцёнкам,
ён ужо завіс над ім, завіс,
каб упасці каменем уніз!..

А маленькі ўсцешана, гулліва
цягне ручаняты свае да
дзьмухаўца на ўскрайку луга-нівы,
кволенькі, бы дзьмухавец, шчаслівы
у няведанні, што ёсць бяда...

Хоць бы хто з'явіўся, хоць хто-небудзь
уварваўся ў цяжкі сон мой, дзе,
нібы ў страшнай казцы, вось-вось з неба
чорны птах той на дзіця ўпадзе!..

4.
**Званіца**

Наяве не бачыла гэтай званіцы ніколі,
але гайданупцца званы —
і лёд майго неба
          на белыя крыгі расколецца,
і, як аблачыны,
          сплываюць, сплываюць яны.

Абуджаны вецер,
          набраклы магутнай вільготай,
не ўтойвае навіны,
і ценькія дубчыкі радасці, кволыя, цнотныя,
пупышкамі рвуць усе
          долу майго кайданы.

Надзеям, жаданням, імпэту —
          раскутая воля:
вяртаюся ў дом з чужыны!..

Наяве не бачыла гэтай званіцы ніколі,
але —
          гайданупцца званы
і — !..

5.
**Сяброўства**

Мне папраўдзе цябе не стае,
непрысутнасць твая ёсць з найгоршых.
Падаю табе рукі свае
разам з сонцам сяброўства ў прыгоршчах.

Бляск ягоны — адно паглядзі —
нетру цемрадзі ўраз прасякае.
Аб'явіся, бліжэй падыдзі,
сонца гэтае не апякае.

А дзівосна ярчэе, калі
чыстай музыкай душаў стаецца.
Гэта холад чужання смыліць,
каля самага сэрцайка ўецца...

Мне папраўдзе цябе не стае.

6.
**Цішыня**

Ціха-ціха. У паветры ані веву.
Роўнядзь неба, як прасеяны падзол,
аблягае ўчаравана моўкны дол,
дзе ні каменя, ні кусціка, ні дрэва.

Ціха-ціха. Ні кузурынкі, ні птушкі.
Хто ўсе гукі сёння скраў, схаваў куды?
Ані ўсплёсінкі на роўнядзі вады,
ані зыку хоць якой малое мушкі...

Што народзіць гэтай пругкай цішы ўлонне?
Дзесьці спяць якой навіны пасланцы?..
Як сіроткі, ля вады тры дзьмухаўцы, —
ажно хочацца іх затуліць далонню...

# ПАЎДЗЁН

*Памяці Васіля Сахарчука*

Грымела, бліскала, ліло,
золь верыла ў сваё сіло,
а поўдзень — выспеў
і ўзяў пад корсткае крыло
душу на выспе
нязгоды
 ўсё прыняць, як дар —
золь тую, той самоты скварс...

Мярэжыць сонца
збуялы ліпеньскі абшар
да валаконца.

Душа ўзіраецца ў паўдзён
і шлях далейшы ёй відзён...

## КУПАЛЬСКАЕ

*Галіне Скарыне*

Юдольныя,
            і плацім мыта
за ўсё, што выпадзе ў дарозе:
найперш —
            за пыл ды за каменне,
за град
            і за няшчаду спёкі,
але —
            і за глыток з крыніцы,
і за ліповы пах мядовы,
і за сцяжыну прад вачыма,
і за валошку каля сэрца...

А Купалка зноў гукае
ночкі цёмнай не баяцца,
кветку-папараць шукаць...

* * *

Ляціць майго лёсу кульгавае кола
з долу ў нябёсы — як з неба дадолу...

## ПАЛЁТ НАД ЖЫТАМ. УДОМА

Ніхто не дзівуецца
лёту майму па-над жытам,
дый хто б дзіваваўся,
калі анідзе ні істоты.
Бязлюдна.
Бязмоўна.
Бязвеўна.
Бязмежна разліты
спакой ціхамірны.
Ні тлуму, ані адзіноты.

За полем даспелым,
за хвойнікам срэбназялёным
мой дом, дзе ўсё — новае:
сцены, і столь, і масніцы.
Чакаюць у шафе расчыненай
строі-абновы.
А свежая стружка ў кутку
так духмяніць жывіцай!

І босым нагам цёпла-цёпла
          на жоўтай падлозе,
і дыхаецца лёгка-лёгка:
          ну вось я і ўдома,
дзе ўсё навакола мяне
          і ўва мне
                    прайнялося
нарэшце-ткі сонцам,
          так з'яўненым,
                    а невідомым...

## ЗМЕСТ

Схованка ... 3
Жыццё — як казка ... 4
Скрыпка ... 5
Накідаюць... ... 6
Ластаўка ... 7
Не чуе ... 8
Зерне ... 9
*Калі б замовіла свой страх...* ... 10
Да сустрэчы! ... 11
*Адыходзяць мае беларусачкі...* ... 12
Будзем! ... 13
*Асвойваем юдоль мы ненамарна...* ... 14
З гравюры А. Каратковай ... 15
Залатая дзіда ... 16
Пчолка ... 17
Угняздуй мяне ў сэрцы ... 18
*Пры сцежцы...* ... 20
*І гэтай ноччу...* ... 21
11 верасня 2001 года ... 22
*Дзеля чаго Ты, Божа...* ... 23
Пасля шторму ... 24
*Узіраешся ў побыт...* ... 25
Воран кружыць ... 26
*Недзе ўзважваецца наш унёсак...* ... 27
*Воблака душы з улады тлуму...* ... 28
*Яшчэ ўсё навіваецца вопрадзень...* ... 29
Брат-сястрыца ... 30
*Звычайны, беспадзейны дзень...* ... 31
Дарунак лёсу ... 32
Скрыпач ... 33
Прыстанак звецца «Шлях» ... 34

*І ветрам звейваліся...* ........ 35
Лісцёвая завея ........ 36
*З пaўдня — пяшчотных промняў паўнаўладдзе...* ........ 37
Паданне лісця ........ 38
Мароз на дварэ ........ 39
У той хаце ........ 41
*Дзеля кожнага тут...* ........ 42
З думкай пра бацьку ........ 43
Песня Змяі ........ 44
Не спазніся ........ 45
Чуйнар ........ 46
Пятнаццаты санет ........ 47
*Ад'ехаў ты...* ........ 48
Яшчэ помніцца ........ 49
*Слова мае не накліча бяды...* ........ 50
Трохі дзіўна ........ 51
*Бачыць Бог...* ........ 52
На змярканні ........ 53
*Божа...* ........ 54
Паводле карцінаў М. К. Чурлёніса:
1. Дзень ........ 55
2. Стралок ........ 56
3. Казка ........ 57
4. Званіца ........ 58
5. Сяброўства ........ 59
6. Цішыня ........ 60
Паўдзён ........ 61
Купальскае ........ 62
*Ляціць майго лёсу...* ........ 63
Палёт над жытам. Удома ........ 64

**Мацяш Н.**
М35 Богава дрэва: вершы / Ніна Мацяш. – Мн.: «Выд-ва “Про Хрысто”», 2004. – 68 с. — (Бібліятэка часопіса «Наша вера»).

ISBN 985-6628-59-8.

Вершы беларускай паэткі і перакладчыцы, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова Ніны Мацяш аб’яднаны адной тэмай — тэмай духоўнасці. Паэзія Н. Мацяш кранае гранічнай шчырасцю, тонкасцю самавыяўлення, эмацыянальнай насычанасцю ўспрымання свету ва ўсіх яго праявах.

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

Літаратурна-мастацкае выданне

**Мацяш** Ніна Іосіфаўна

**Богава дрэва**

Вершы

Рэдактар К. Лялько
Карэктар Л. Камінская
Тэхнічны рэдактар А. Глекаў
Камп’ютэрная вёрстка К. Хвагінай

Падпісана да друку 16.12.2004 г.
Фармат 70x100 1/32. Папера афсетная. Гарнітура Petersburg.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 2,15. Ул.-выд. арк. 0,75.
Наклад 500 асобнікаў. Зак. № .

ВУП «Выдавецтва “Про Хрысто”».
220030 г. Мінск, пл. Свабоды, 9, п.2
ЛИ №02330/0056927 ад 1.04.2004 г.
**http:**//pro-christo.catholic.by; **e-mail:** pro-christo@catholic.by.

Надрукавана з дыяпазітываў заказчыка ў друкарні УП «ХОДР»
ОО «БелТІЗ». ЛП №02330/0056661 ад 29.03.2004 г.
220004, г. Мінск, вул. Вызвалення, 9.